# Са знакам якасці

**Забеспячэнне даступнасці якаснай дашкольнай адукацыі, узмацненне паспяховай сацыялізацыі школьнікаў у дынамічных умовах лічбавага грамадства, дапамога ім у выбары прафесіі, удасканаленне зместу навучання і прымяненне сучасных тэхналогій, падрыхтоўка канкурэнтаздольных кадраў і іх працаўладкаванне — развіццё галіны абмеркавалі на пасяджэнні выніковай калегіі Міністэрства адукацыі.**

## Пад слоганам "упершыню"

— Многія падзеі ў сістэме адукацыі ў 2025 годзе адбыліся пад слоганам "упершыню". Так, работа з адоранымі школьнікамі выйшла на новы ўзровень пасля старту вочна-дыстанцыйнай алімпіяды, якая праводзіцца круглы год. У яе рамках упершыню рэалізаваны фармат "настаўнік — вучань". Такі падыход важны, паколькі дазваляе педагогам развівацца ў прафесійным плане і перадаваць навучэнцам веды высокага ўзроўню, — сказаў міністр адукацыі Андрэй Іванец.

Таксама ўпершыню беларускі старшакласнік стаў абсалютным пераможцам Міжнароднай геаграфічнай алімпіяды, і зараз Мікалай Місюк лічыцца лепшым юным географам у свеце.

— Поспехі нашых школьнікаў на міжнародных прадметных алімпіядах з'яўляюцца пацвярджэннем якасці айчыннай адукацыі. У мінулым годзе на такіх спаборніцтвах заваяваны 74 медалі рознай вартасці, — падкрэсліў кіраўнік галіны.

Ён нагадаў, што ў сістэме прафесійнай адукацыі была ўзмоцнена практыкаарыентаванасць адукацыйнага працэсу. Створаны 53 цэнтры кампетэнцый, дзе ў адукацыйны працэс укараняюцца сучасныя тэхналогіі, прымяняюцца найноўшыя сродкі навучання і абсталяванне. Штогод больш за 30 тысяч юнакоў і дзяўчат праходзяць навучанне на іх базе.

Вясной 2026 года будзе праведзена другое Нацыянальнае даследаванне якасці адукацыі. Усе неабходныя матэрыялы для падрыхтоўкі даступныя на нацыянальным адукацыйным партале і сайце РІКВ.

Па даручэнні кіраўніка дзяржавы на ўзроўні прафтэхадукацыі ўпершыню пачата стварэнне вучэбна-вытворчых майстэрань на базе арганізацый — заказчыкаў кадраў. Ужо адкрыта 65 майстэрань, у якіх навучэнцы каледжаў вучацца на сучасным вытворчым абсталяванні. І работа працягнецца.

— Ва ўніверсітэтах упершыню створаны студэнцкія канструктарскія бюро (СКБ) для падтрымкі навукова-тэхнічнай дзейнасці моладзі. У 13 установах вышэйшай адукацыі ўжо адкрыта 16 СКБ па матэрыялазнаўстве, машынабудаванні, мікраэлектроніцы, будаўніцтве і архітэктуры, тэхналогіях харчовай прадукцыі, транспарце і электратэхніцы. На дасягнутым спыняцца не збіраемся, у 2026-м павінна быць арганізавана работа яшчэ як мінімум 5 бюро, — анансаваў Андрэй Іванавіч.

Ён акцэнтаваў увагу, што сёння ўзрасла запатрабаванасць рабочых і спецыялістаў сярэдняга звяна:

— На наступную пяцігодку мы ставім задачу, каб выпускнікі 9-х класаў свядома выбіралі траекторыю паступлення ў каледж, каб яна стала адной з прыярытэтных нараўне з навучаннем у 10—11-х класах. На ўзроўні вышэйшай адукацыі мы бачым неабходнасць укаранення новых падыходаў, але з захаваннем традыцыйных, якія сябе добра зарэкамендавалі.

Акрамя гэтага, напрыканцы жніўня па ініцыятыве Мінадукацыі стартаваў маштабны праект — нацыянальная школа рэктараў.

— Яна стала своеасаблівай "зверкай гадзіннікаў" для вышэйшай школы, прадстаўнікоў органаў дзяржкіравання, галіновых міністэрстваў і бізнесу. Правядзенне падобнага мерапрыемства ў фармаце дыскусійнага клуба выклікала вялікую цікавасць і даказала сваю запатрабаванасць. Такія сустрэчы для кіраўніцтва УВА збіраемся зрабіць штогадовымі, — паведаміў кіраўнік адукацыйнага ведамства.

## Канкурэнтаздольныя кадры

Павышэнне якасці і ўзмацненне канкурэнтаздольнасці працоўных рэсурсаў — адна з галоўных агульнадзяржаўных задач. Прафесійна-тэхнічная і сярэдняя спецыяльная адукацыя — найважнейшы рэсурс развіцця Беларусі, адзін з галоўных механізмаў эканамічнага росту і рэалізацыі інавацый.

У цэлым сістэма прафесійнай адукацыі развіваецца паступальна. Павелічэнне колькасці навучэнцаў, прахадных балаў і конкурсаў пры паступленні ў каледжы, высокая запатрабаванасць выпускнікоў сведчаць аб прывабнасці і высокай якасці падрыхтоўкі.

— У кастрычніку мінулага года ўрадам зацверджана Праграма развіцця прафтэх- і сярэдняй спецыяльнай адукацыі на 2026—2028 гады. Напружаныя індыкатары і канкрэтныя мерапрыемствы закладзены ў Дзяржпраграму "Беларусь інтэлектуальная". Але ўжо сёння нам неабходна забяспечыць павелічэнне долі практыка-арыентаванага навучання, павышэнне гнуткасці адукацыйных праграм і іх абнаўленне, удасканаленне сістэмы ўзаемадзеяння з арганізацыямі — заказчыкамі кадраў, а таксама абнаўленне ў адпаведнасці з сучаснымі патрабаваннямі матэрыяльна-тэхнічнага абсталявання адукацыйнага працэсу, — расказаў Андрэй Іванец.

Ён нагадаў, што ў маі 2025 года пастановай урада зацверджана Канцэпцыя развіцця інжынернай адукацыі. Яна ўключае шэраг ключавых палажэнняў: ад прафарыентацыі школьнікаў і павышэння прэстыжу інжынерных прафесій да актыўнага ўключэння заказчыкаў кадраў і ўсіх зацікаўленых у падрыхтоўку студэнтаў. Пэўныя вынікі ўжо дасягнуты, пастаўлены амбіцыйныя задачы на 2026 год.

Летась ажыццявілі мадэрнізацыю адукацыйнага асяроддзя. Напрыклад, сумесна з прадпрыемствамі Мінпрама, Мінэнерга, канцэрна "Белнафтахім" праведзена работа па аснашчэнні цэнтраў кампетэнцый БДУІР, БНТУ, ПДУ імя Еўфрасінні Полацкай і БрДТУ.

**Ключавыя тэндэнцыі развіцця сістэмы адукацыі Беларусі:**

✓ арыентацыя на асобу навучэнца;

✓ бесперапыннасць адукацыі;

✓ кампетэнтнасны падыход;

✓ неразрыўнасць навучання і выхавання;

✓ забеспячэнне даступнасці і якасці адукацыі.

Андрэй Іванавіч дадаў, што актуальнай застаецца задача ўдасканалення зместу адукацыі і прымянення сучасных тэхналогій:

— У 2026 годзе гэтая работа павінна быць працягнута. Практыкаарыентаванасць навучання з'яўляецца найважнейшай задачай. Эканоміка краіны чакае маладога спецыяліста, які валодае глыбокімі, фундаментальнымі ведамі, практычнымі навыкамі і гатовы пачаць працаваць без доўгай адаптацыі.

Дзеля гэтага, напрыклад, Полацкі ўніверсітэт сумесна з "Нафтанам" з верасня рэалізоўвае пілотны праект з элементамі дуальнага навучання па спецыяльнасцях "Перапрацоўка нафты і газу і прамысловы арганічны сінтэз" і "Тэхналагічныя машыны і абсталяванне".

— Дуальнае навучанне ў прафесійнай адукацыі прадугледжвае спалучэнне канцэнтраванай тэарэтычнай падрыхтоўкі на 1 і 2 курсах і, пачынаючы з 3-га, навучанне на працоўным месцы на базе арганізацыі — заказчыка кадраў. Гэта дазволіць студэнтам атрымліваць каштоўны вопыт работы яшчэ падчас вучобы, прызвычаіцца да працоўных працэсаў і быць гатовымі да рэальных задач пасля выпуску, а арганізацыі — рыхтаваць спецыялістаў, адаптаваных да сваіх патрабаванняў, — падкрэсліў рэктар ПДУ Юрый Раманоўскі.

Па словах міністра адукацыі, у мэтах выканання даручэння Прэзідэнта Беларусі сумесна з Мінпрацы прадумваецца магчымасць працаўладкавання студэнтаў старшых курсаў на прадпрыемства па спецыяльнасці.



> *Практыкаарыентаванасць навучання — найважнейшая задача. Эканоміка краіны чакае маладога спецыяліста, які валодае глыбокімі, фундаментальнымі ведамі, практычнымі навыкамі і гатовы пачаць працаваць без доўгай адаптацыі.*
>
> **Андрэй ІВАНЕЦ.**

## Новы імпульс

Гаворачы пра планы на 2026 год, Андрэй Іванец адзначыў, што непарушнымі застаюцца асноўныя прынцыпы:

— Першы — даступнасць адукацыі. Ставім амбіцыйныя задачы па павышэнні даступнасці дашкольнай адукацыі для дзяцей ва ўзросце да 2 гадоў. Гэта робіцца для таго, каб у Год беларускай жанчыны маладыя маці маглі рэалізоўваць сябе прафесійна. Другі прынцып — якасць адукацыі. Мы павінны дасягнуць у найбліжэйшую пяцігодку 50-працэнтнага практыка-арыентаванага кампанента на ўзроўні каледжаў і ўніверсітэтаў. Для гэтага ўкараняюцца новыя формы ўзаемадзеяння з заказчыкамі кадраў, якія дазваляюць арганізаваць дуальную форму атрымання адукацыі.

Вясной 2026 года будзе праведзена другое Нацыянальнае даследаванне якасці адукацыі. Яго галоўная мэта — атрыманне аб'ектыўнай і дакладнай інфармацыі аб узроўні функцыянальнай дасведчанасці навучэнцаў. Усе неабходныя матэрыялы для падрыхтоўкі даступныя на нацыянальным адукацыйным партале і сайце РІКВ.

— У сістэме адукацыі галоўнай рухаючай сілай быў, ёсць і застанецца педагог. Знакавая падзея гэтага года — конкурс прафесійнага майстэрства "Настаўнік года Рэспублікі Беларусь", які з'яўляецца своеасаблівым педагагічным алімпам. Ужо завершаны раённы этап, у сакавіку пройдзе абласны, які ўпершыню будзе арганізаваны з улікам новых падыходаў і стане фестывалем педагагічнага майстэрства ў рэгіёнах. У верасні, напярэдадні прафесійнага свята Дня настаўніка, адбудзецца заключны этап конкурсу. Сёлета дабаўлены дзве намінацыі: "Малады настаўнік" і "Малады дырэктар", — канстатаваў кіраўнік адукацыйнага ведамства.

Безумоўна, Андрэй Іванавіч не пакінуў без увагі развіццё ўніверсітэцкіх навуковых школ, што таксама з'яўляецца немалаважнай задачай на гэтую пяцігодку:

— У снежні мінулага года зацверджаны шэсць рэгіянальных навукова-тэхнічных праграм. Менавіта інжынерна-тэхнічныя УВА павінны стаць драйверам рэгіянальнага развіцця. Цяпер ідзе напаўненне канкрэтнымі праектамі. Упэўнены, гэта надасць новы імпульс узаемадзеянню ўніверсітэцкай, галіновай і акадэмічнай навукі.

Акрамя таго, Беларусь удастоена гонару стаць на некалькі дзён цэнтрам міждзяржаўнага супрацоўніцтва ў сферы адукацыі. Так, у чэрвені адбудзецца X нарада міністраў адукацыі дзяржаў — членаў Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва. А восенню ў Мінску пройдзе IX з'езд настаўнікаў і работнікаў адукацыі дзяржаў — удзельніц СНД.

— Сёння ў Беларусі вучацца больш за 37 тысяч замежных студэнтаў са 118 краін, кожны трэці з іх — кітаец. Экспарт паслуг у галіне адукацыі за студзень — лістапад 2025 года склаў рэкордныя 199 млн долараў, яшчэ ў пачатку пяцігодкі гэта было 98 млн долараў. Беларускімі ўніверсітэтамі забяспечана амаль двухразовае павелічэнне рэалізуемых сумесных праграм і створаных сумесных адукацыйных і навуковых структур з арганізацыямі Расіі, Кітая, Узбекістана, Казахстана, — праінфармаваў Андрэй Іванец.

А яшчэ ён падзяліўся меркаваннем, што існуючая мадэль работы з моладдзю патрабуе перафарматавання:

— Для кожнай катэгорыі павінны быць свае фарматы. Школьнікі — прафарыентацыя, працоўнае і патрыятычнае выхаванне. Студэнты — стартапы, навуковыя праекты, валанцёрства, кіраўніцкія школы. Працуючая моладзь — прафесійная рэалізацыя, сацыялізацыя праз традыцыйныя сямейныя каштоўнасці. Нефармальная моладзь — дыялог, культурныя і спартыўныя акцыі. Вынікам работы павінна стаць зніжэнне адтоку моладзі з рэгіёнаў, рост маладзёжнага прадпрымальніцтва праз стартап-рух, фарміраванне актыўнага кадравага рэзерву, павышэнне даверу маладога пакалення да дзяржавы, умацаванне грамадзянскай адказнасці.

**Вольга АНТОНЕНКАВА.**
**Фота Алега ІГНАТОВІЧА.**